# З ГІСТОРЫІ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ГАЛІНЕ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЕЙНАГА ПЕРСАНАЛУ

**А. А. Гужалоўскі,** *доктар гістарычных навук, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ, сябра Міжнароднага камітэта па падрыхтоўцы музейнага персаналу Міжнароднага савета музеяў*

Пытанні міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне прафесійнай адукацыі будучых музейных супрацоўнікаў упершыню былі ўзняты адразу ж пасля стварэння Міжнароднага савета музеяў (ICOM) у 1946 г. На першай канферэнцыі ICOM, якая праводзілася ў 1947 г. у Мехіка і была прысвечана выпрацоўцы афіцыйнага статусу Міжнароднага савета музеяў і яго ўзаемаадносін з UNESCO, спецыяльнае пасяджэнне датычылася падрыхтоўкі музейнага персаналу. Яго вынікам было ўключэнне ў дагавор паміж UNESCO і ICOM асобнага пункта, у якім апошні браў на сябе абавязкі маніторынгу на нацыянальным узроўні і міжнароднай каардынацыі падрыхтоўкі будучых музейных спецыялістаў. Гэтае пытанне было зноў узнята на першай Генеральнай канферэнцыі ICOM у Парыжы ў 1948 г., прычым яно атрымала там далейшую канкрэтызацыю ў выглядзе абмеркавання новых музейных спецыялізацый – «музейны педагог» і «спецыяліст па грамадскіх сувязях музеяў».

У 1950 г. дыскусія пра падрыхтоўку музейных спецыялістаў была перанесена ў рамкі нанова створанай структурнай адзінкі ICOM – Камісіі па адміністрацыі і персаналу. Яе дзейнасць актыўна падтрымліваў генеральны сакратар ICOM Ж.-А. Рыўер, які ў 1955 г. прызначыў некалькіх экспертаў па вывучэнні пытання якасці прафесійнай падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў у глабальным маштабе. Вынікам іх працы сталі рэкамендацыі, у якіх называліся два спосабы атрымання музейнай кваліфікацыі – праз дзённае навучанне ў якасці студэнта па адной са спецыялізаваных універсітэцкіх праграм, а таксама праз курсы павышэння кваліфікацыі для дзеючых музейных супрацоўнікаў. Акрамя таго, у сваіх рэкамендацыях эксперты прапанавалі тры ўзроўні, альбо прыступкі, на шляху да музейнага прафесіянала: базавы ўзровень – агульны ўзровень – спецыялізаваны ўзровень.

Пытанні падрыхтоўкі музейнага персаналу, на гэты раз музейных педагогаў, былі зноў узняты на міжнародным узроўні на Сімпозіуме UNESCO–ICOM, які праводзіўся ў Парыжы ў 1964 г. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго выніковым дакуменце ўдзельнікі сфармулявалі кваліфікацыйны мінімум, неабходны для кандыдатаў на пасаду музейнага педагога: базавая музеялагічная адукацыя, базавая педагагічная адукацыя, а таксама камунікатыўныя навыкі. Удзельнікі сімпозіума таксама заклікалі міжнародную супольнасць куратараў музеяў разглядаць тых, хто працуе з наведвальнікамі ў залах, як роўных сабе.

Важным крокам на шляху фарміравання музейнай прафесіі была Генеральная канферэнцыя ІСОМ, якая адбылася ў 1965 г. у Нью-Ёрку пад назвай «Падрыхтоўка музейнага персаналу». На ёй удзельнікі дамовіліся аб адкрыцці пад эгідай ІСОМ трох міжнародных праграм, якія былі павінны мець эксперыментальны характар, па падрыхтоўцы музейных супрацоўнікаў. Другім непасрэдным вынікам нью-ёркскай канферэнцыі было правядзенне ў 1967 г. ва Універсітэце імя Т. Масарыка ў Брно (ЧССР) міжнароднай сустрэчы экспертаў у дадзенай галіне. На сустрэчы ў Брно, дзе прысутнічалі 13 выкладчыкаў з васьмі еўрапейскіх краін, абмяркоўваліся праблемы стандартызацыі музейных адукацыйных праграм, методыкі выкладання, абмену паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Была пастаўлена задача распрацоўкі «Базавага вучэбнага плана музейнай падрыхтоўкі ІСОМ». Разам з гэтымі прадуктыўнымі крокамі наперад удзельнікі сустрэчы ў Брно сфармулявалі агульную канцэпцыю падрыхтоўкі музейных кадраў, якая шмат разоў крытыкавалася і крытыкуецца цяпер прадстаўнікамі музейнай прафесіі. У сціслым выглядзе яе можна сфармуляваць наступным чынам. Усе музейныя адукацыйныя праграмы павінны прапаноўваць прафесійную падрыхтоўку двух узроўняў: 1) куратарскую (для патэнцыяльных кіраўнікоў музейных устаноў), якая ўключае комплекс музеяграфічных і музеялагічных ведаў; 2) музейна-тэхналагічную (для кандыдатаў на ніжэйшыя пасады), якая ўключае толькі музеяграфічныя веды.

На Генеральнай канферэнцыі ІСОМ 1968 г. у Мюнхене на базе Камісіі па адміністрацыі і персаналу быў створаны сучасны Міжнародны камітэт па падрыхтоўцы персаналу (ІСТОР). Яго першым старшынёй стаў Р. Сінглтан – загадчык кафедры музеялогіі Лейстэрскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) – толькі створанага ў той час цэнтра падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. Першымі сябрамі камітэта сталі Ж.-А. Рыўер, Ф. Талбат і інш. Новы камітэт пачаў сваю работу са збору інфармацыі пра дзеючыя праграмы музейнай адукацыі, у т. л. за межамі еўрапейскага кантынента. Вынікам гэтай работы стала выданне міжнароднага даведніка для жадаючых атрымаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музейную падрыхтоўку [4]. Цяжкай справай для сяброў камітэта ў тыя гады было пагадненне з кіраўніцтвам шэрагу ўніверсітэтаў, якія не разумелі задач музеялогіі і музеяграфіі і іх выкладання ў вышэйшай школе.

На Генеральнай канферэнцыі ICOM 1971 г. у Парыжы–Грэноблі быў ухвалены «Базавы вучэбны план музейнай падрыхтоўкі ICOM». У ім пералічваўся мінімум дысцыплін, веданне якіх неабходна для выканання прафесійных абавязкаў у музеі. У значнай ступені ён абапіраўся на бачанне музеялагічнай і музеяграфічнай падрыхтоўкі Ж.-А. Рыўера, які да таго часу ўжо стварыў пад эгідай ICOM праграму падрыхтоўкі музейнага персаналу ва ўніверсітэце Парыжа.

Пачынаючы з 1974 г. сябры ICTOP збіраюцца штогод у розных гарадах свету. Кожная з гэтых сустрэч мае сваю тэматычную накіраванасць. Напрыклад, удзельнікі сустрэчы 1978 г. у Бруселі абмяркоўвалі праблемы ўзаемадзеяння ўніверсітэтаў і музеяў у навучальным працэсе, балансу паміж тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкай будучых супрацоўнікаў музеяў. На сустрэчы была прынята рэкамендацыя, паводле якой усе праграмы навучання павінны ўключаць 6-месячную інтэрнатуру ў дзеючых музеях. Адпаведна кіраўніцтву ўніверсітэтаў было рэкамендавана прымаць на пасады выкладчыкаў музеялагічных і музеяграфічных дысцыплін толькі асоб, якія мелі вопыт практычнай работы ў музеях, альбо дзеючых музейных супрацоўнікаў. На наступных сустрэчах сябры ICTOP абмяркоўвалі пытанні мэт і методыкі выкладання, дыстанцыйнага навучання, музейных спецыялізацый.

Да правядзення Генеральнай канферэнцыі ICOM у 1980 г. у Мехіка кіраўніцтва ICTOP прымеркавала выданне кнігі «Прафесійная падрыхтоўка музейнага персаналу: агляд палітыкі і дзейнасці ICOM у 1947–1980 гг.», якая падвяла першыя вынікі дзейнасці ў дадзенай галіне. А праз два гады ў Атаве адбыўся буйнейшы (у сэнсе колькасці ўдзельнікаў) сумесны сімпозіум ICTOP і Музейнай асацыяцыі Канады, прысвечаны бесперапыннай музейнай адукацыі. Да найважнейшых тэм, вынесеных на абмеркаванне сімпозіума, адносіліся таксама падрыхтоўка музейных лідараў (дырэктараў і кіраўнікоў падраздзяленняў музеяў) і міждысцыплінарны характар работы ў музеі. Упершыню прагучала пытанне падрыхтоўкі тэхнічнага персаналу музеяў.

Сябры ICTOP бралі чынны ўдзел у распрацоўцы Кодэкса прафесійнай этыкі ICOM, які ўхвалены на Генеральнай кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцыі ICOM у Буэнас-Айрэсе ў 1986 г. Там жа на першы план выйшла тэма дапамогі міжнароднай музейнай супольнасці краінам, якія развіваюцца, у галіне падрыхтоўкі музейных кадраў. У якасці найбольш паспяховага прыкладу прыводзіўся вопыт арганізацыі і работы міжнароднай школы музеялогіі ў Егіпце [1].

У 1990–2000 гг. на міжнародных сустрэчах выкладчыкі музеялагічных і музеяграфічных дысцыплін працягвалі абмеркаванне надзённых праблем, такіх як падрыхтоўка спецыялістаў у галіне менеджменту музейных устаноў, знікненне з музеяў спецыялістаў-таксідэрмістаў і інш. Важным дасягненнем таго часу была распрацоўка ў 2008 г. стандартнага рэестра музейных спецыяльнасцей унутры музейнай прафесіі на міжнародным узроўні з улікам нацыянальных традыцый Францыі, Італіі, Германіі і Швейцарыі [3].

На Генеральнай канферэнцыі ICOM у Шанхаі ў 2010 г. старшынёй ICTOP, колькасць сяброў якога ўжо дасягнула лічбы 200, была абрана вядомы канадскі музеёлаг прафесар Л. Цітэр. Сёння сябрамі ICTOP з'яўляюцца прадстаўнікі кафедр музеялогіі ўніверсітэтаў Францыі, ЗША, Кітая, Расіі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Нідэрландаў, Латвіі, Беларусі. Сярод іх – З. Странскі, П. Бойлан, Н. Фулер, П. ван Менш, А. А. Сундзіева і інш.

У наш час ICOM, як і 65 гадоў таму назад, канцэптуальна разглядае музейную адукацыю як адзін з найважнейшых напрамкаў сваёй дзейнасці і паспяховай музейнай дзейнасці ў цэлым. Узгаданы вышэй даведнік ICOM, выдадзены ў 1970 г., пералічваў каля 100 праграм музейнай падрыхтоўкі ў тагачасным свеце, але значная іх частка яшчэ ўяўляла кароткатэрміновыя курсы альбо інтэрнатуру з некалькімі слухачамі альбо інтэрнамі без якога-небудзь фармальнага навучання. Даведнік для жадаючых атрымаць музейную падрыхтоўку, выдадзены ICTOP у 1987 г., налічваў ужо больш за 500 пазіцый [2]. Акрамя старых класічных цэнтраў падрыхтоўкі музейнага персаналу кшталту Луўрскай школы, Лейстэрскага ўніверсітэта, Універсітэта імя Т. Масарыка ў Брно, Смітсанаўскага інстытута, Рэйнвардскай акадэміі, мы знаходзім у ім маладыя ўніверсітэцкія кафедры музеялогіі ў Расійскім дзяржаўным гуманітарным універсітэце, Універсітэце Д. Вашынгтона і

інш. Пазнаёміцца з імі можна на сайце, прысвечаным удасканаленню ў музейнай прафесіі[1].

На апошняй штогадовай канферэнцыі ICTOP, якая адбылася 23–26 кастрычніка 2011 г. у Таронта (Канада), галоўнай мэтай дзейнасці Камітэта па падрыхтоўцы персаналу была названа прафесіяналізацыя ўсіх напрамкаў музейнай дзейнасці ў глабальным маштабе. ICTOP імкнецца праводзіць навучанне і прафесійнае развіццё, а таксама павышаць агульны прафесійны ўзровень музейных спецыялістаў на працягу іх кар'еры ў супрацоўніцтве з іншымі нацыянальнымі і міжнароднымі камітэтамі ICOM. Дзейнасць ICTOP увасабляецца ў правядзенні штогадовых агульных канферэнцый, спецыялізаваных сустрэч, інфармацыйных рассылак, кансультацый, а таксама перыядычным выданні міжнароднага даведніка па падрыхтоўцы музейнага персаналу[2].

1. *Boylan, P. J.* The training of museum personnel: a major concern of ICOM and of UNESCO for forty years / P. J. Boylan // Museum International. – 1987. – N 156. – P. 225–231.

2. *International* Directory of Museum Training. – Smithsonian Institution, 1987. – 272 p.

3. *Museum* Professions – a European Frame of Reference. – URL:http://ictop.alphahosting.org/.

4. *Training* of Museum Personnel. – London: Hugh Evelyn for ICOM, 1970. – 242 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] URL:http://hosting.wave.co.nz/~jollyroger/GM2/study/study.htm.
[2] URL:http://www.ictop.org/.